**Ярохіна С.К.,** *дацэнт*

# ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ НАРОДНЫХ КАНСЕРВАТОРЫЙ НА БЕЛАРУСІ

Будаўніцтва культуры новага тыпу ў Беларусі пачалося пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менавіта ў гэтыя гады быў закладзены фундамент будучай культуры, якая ўвабрала ў сябе, з аднаго боку, дасягненні шматгадовай дзейнасці беларусаў, з другога - парасткі новага светаадчування і светасузірання, што і вызначыла далейшыя шляхі развіцця мастацкаі творчасці. Працэс стварэння новай культуры не працякаў хутка і проста, ён быў звязаны са шматлікімі цяжкасцямі і супярэчнасцямі жыцця, а таму праходзіў у складаных умовах барацьбы старога і новага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культурная дзейнасць у гэты перыяд дастаткова шматслойная і амаль аднолькава інтэнсіўна працякае ва ўсіх буйных гарадах Беларусі. Кожны больш-менш буйны горад становіцца культурным цэнтрам у сваім рэгіёне і адыгрывае ў ім важную ролю. Дастаткова пералічыць гарады Віцебск, Гомель, Магілёў, у якіх дзейнічалі літаратурна-мастацкія таварыствы і музычна-тэатральныя калектывы.

З вялікім размахам у першыя гады савецкай улады працякала культурнае жыццё Віцебска. Тут былі шырока прадстаўлены розныя творчыя школы і напрамкі ў галіне выяўленчага мастацтва і музыкі.

Першая прафесійная музычная ўстанова - народная кансерваторыя - пачала працаваць у Віцебску ў 1918 г. На пасаду дырэктара гэтай установы быў запрошаны вядомы музычны дзеяч, дырыжор і педагог М.Малько (1883-1961), вучань М.А.Рымскага-Корсакава. У першы год у народную кансерваторыю было прынята 209 навучэнцаў. Сярод іх - 20 вакалістаў, 49 скрыпачоў, 14 віяланчэлістаў, 2 чалавекі ў класе кампазіцыі, 2 валтарністы і інш.

М.Малько ўзначаліў сімфанічны аркестр, а яго калега М.Анцаў (1865-1945) - таксама вучань Рымскага-Корсакава - стварыў харавы калектыў, які ў лютым 1920 г. атрымаў статус дзяржаўнага.

Разам з падрыхтоўкай прафесійных музыкантаў з асяроддзя рабочых і сялян народная кансерваторыя вяла вялікую асветніцкую работу.

Значэнне яе было цяжка пераацаніць у тыя гады, калі практычна адсутнічалі іншыя формы мэтанакіраванай і планамернай канцэртна-выканальніцкай дзейнасці.

Неўзабаве выканальніцкія калектывы народнай кансерваторыі - сімфанічны аркестр і хор - пачалі рэгулярна выступаць перад публікай і атрымалі ў горадзе шырокую папулярнасць.

Навучальныя ўстановы, падобныя да народнай кансерваторыі ў Віцебску, былі адкрыты ў Гомелі (1919), Мінску (1920) і Бабруйску (1921). У Бабруйскай кансерваторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

займаліся 211 студэнтаў. Акрамя таго, пры кансерваторыі працавала і агульнаадукацыйнае аддзяленне, якое наведвалі яшчэ 40 чалавек.

У ліпені 1919 г. адбылося адкрыццё Гомельскай кансерваторыі. Адным з яе арганізатараў стаў савецкі харавы дырыжор і педагог, кампазітар А.Ягораў (1887-1959), выхаванец Пецярбургскай кансерваторыі, вучань А.Лядава. Дырэктарам Гомельскай кансерваторыі быў М.Назараў (1885-1942), выпускнік Маскоўскай кансерваторыі, аўтар школы ігры на габоі. У Гомелі, разам з выканальніцкімі, былі адкрыты таксама клас гісторыі і эстэтыкі. У 1924 г. сімфанічны аркестр, хор і салісты-педагогі пад кіраўніцтвам Л.Захарава правялі цыкл гістарычных канцэртаў, у праграмы якіх уваходзілі творы заходнееўрапейскіх і рускіх кампазітараў-класікаў: Л.Бетховена, Ф.Шуберта, Р.Шумана, М.Глінкі, П.Чайкоўскага, С.Рахманінава. У гэтых канцэртах, верагодна, прымаў удзел І.А.Туранкоў (1886-1958) - беларускі кампазітар, арганізатар Гомельскай музычнай школы, кіраўнік самадзейных харавых гурткоў, які з 1918 г. жыў у Гомелі.

У сферы прафесійнага мастацтва, у прыватнасці музычнага, праблема выхавання прафесійных кадраў была адной з самых надзённых. Як вядома, для яе вырашэння яшчэ ў 1917-1920 гг. быў падрыхтаваны шэраг мер, з дапамогай якіх можна было ажыццявіць пераход да шматступеннай сістэмы спецыяльнай музычнай адукацыі. Неабходнасць рэформы ў галіне музычнай адукацыі востра адчувалася па ўсёй краіне.

Першая ў Беларусі сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова (Віцебскі музычны тэхнікум) адкрылася на базе народнай кансерваторыі. Гомельская народная кансерваторыя таксама была пераўтворана ў музычны тэхнікум. Такім чынам, дзейнасць народных кансерваторый адыграла станоўчую ролю ў развіцці прафесійнай музычнай адукацыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ